**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб правядзенні рэгіянальнага этапу арт-праекта “Там няма мяне” у рамках патрыятычнай акцыі “Дарогамі Перамогі”, прысвечанай 80-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне**

1. Арганізатарам рэгіянальнага этапу арт-праекта “Там няма мяне” з’яўляецца дзяржаўная ўстанова “Гісторыка-культурны музей-запаведнік “Заслаўе”.

2. Рэгіянальны этап (мінскі раённы) арт-праекта “Там няма мяне” з’яўляецца этапам абласнога арт-праекта “Там няма мяне”, які праходзіць у рамках патрыятычнай акцыі “Дарогамі Перамогі”, прысвечанай 80-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

3. Для ўдзелу ў арт-праекце запрашаюцца ўсе жадаючыя ва ўзросце ад 14 гадоў.

4. Удзельнікі прадстаўляюць адну мастацкую работу па зададзенай тэматыцы. У работах павінны быць адлюстраваныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Мінскага раёна падчас Вялікай Айчыннай вайны, гераічныя подзвігі беларускага народа, гераічныя асобы.

5. Прымаецца адна работа ад аднаго/-ой аўтара/-кі (калектыўныя работы журы не ацэньвае), выкананая абавязкова на аркушы фармату А3. Дапускаецца любая тэхніка выканання малюнка (аловак, гуаш, акварэль, пастэль, алейныя і акрылавыя фарбы і інш.). Малюнак дасылаецца па пошце, пры перасылцы не складваецца. Ён мае абавязкова суправаджацца этыкеткай на заднім баку малюнка, дзе ўказваюцца: прозвішча, імя канкурсанта/-кі, чысло, месяц і год нараджэння, назва работы, кантактныя тэлефоны.

6. Асноўныя крытэрыі ацэнкі выканаўцаў:

адпаведнасць тэматыцы конкурсу;

узровень тэхнічнага майстэрства;

мастацка-эстэтычны ўзровень работ;

глыбіня раскрыцця ідэі твора;

адпаведнасць твора ўзроставым асаблівасцям удзельнікаў.

7. Тэрмін правядзення рэгіянальнага конкурсу — сакавік 2024. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна да 24.03.2024 падаць заяўку і даслаць малюнак на адрас Запаведніка: вул. Рынкавая, д. 8а, 223036, г. Заслаўе.

Для ўдзелу ў абласным арт-праекце “Там няма мяне” работы трох пераможцаў рэгіянальнага конкурсу ў тэрмін да 12.04.2024 будуць пададзеныя арганізатару абласнога конкурсу ў адпаведнасці з Палажэннем аб правядзенні абласнога арт-праекта “Там няма мяне”.

8. Журы фарміруецца з ліку супрацоўнікаў Запаведніка. Склад журы:

Старшыня — Сямашка К.У., намеснік дырэктара па навуковай рабоце – загадчык НЭА;

Сябры журы:

Арцем’ева І.Д., старшы навуковы супрацоўнік АФ;

Гарбачонак Г.І., загадчык АМП;

Рак А.К., галоўны захавальнік фондаў.

9. Лепшыя работы – пераможцы рэгіянальнага этапу конкурсу ў адпаведнасці з палажэннем аб правядзенні абласнога арт-праекта “Там няма мяне” будуць прадстаўленыя на выставачных лакацыях абласнога мерапрыемства 3 ліпеня 2024 падчас правядзення цыкла мерапрыемстваў на мемарыяльным комплексе “Курган Славы”.

Дадатак

**ЗАЯЎКА**
**на удзел у рэгіянальным этапе арт-праекта “Там няма мяне”**
**у рамках патрыятычнай акцыі “Дарогамі Перамогі”, прысвечанай 80-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне**

| № п/ч | Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка/-цы | Узроставая катэгорыя | Назва конкурснай работы | Месца навучання | Кантактны тэлефон, электронны адрас удзельніка/-цы |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | | |
| 2. | | | | | |